# Расце бярозка за акном

Як добра помніць Серафіма Дарафееўна, калі яны ўсяліліся ў гэты дом, невялічкі кволы стволік бярозкі быў амаль роўны з ёю. Ды тады малую ў школе і дома клікалі непрывычным для гэтых мясцін імем — Серафімка. Дзяўчынка расла. Непрыкметна падрастала і бярозка. Ды вось, як кажуць, не паспелі азірнуцца, а, лічы — большая частка жыцця пражыта. Дарафееўна адпрацавала шмат гадоў у бліжняй школе (цяпер яна называецца гімназіяй), вучыла малечу прыродазнаўчым навукам. А беластволае дрэўца ўвабралася ў сілу і зашумела лісцем ужо насупраць вокнаў другога паверху дома.

Пажылы сусед, які там жыў, аднойчы не паленаваўся — дацёгся да мясцовага жылупраўлення і папрасіў:

— Спілуйце дрэва. Святло ў кухні загароджвае.

Лічы, з таго і пачалося. Калі аднойчы ў іхнім двары з'явіліся два дзецюкі з бензапілой, Серафіма рашуча заступілася:

— Ці ж можна, людзі, знішчаць такую прыгажосць? Падумайце: колькі трэба гадоў, каб вымахала такое дрэва? Я вунь ужо на пенсію пайшла, а расла — разумееце? — разам з гэтай бярозай.

Мужчыны нерашуча пераступалі з нагі на нагу і, задраўшы галовы, глядзелі ўверх: там з адчыненага акна зыркаў на іх



ФОТА ТАМАРЫ ВІКТАРАВАЙ

Міхась Даніленка

мужчына з няголеным шчаціністым тварам.

— Не дам спілоўваць! — рашуча прамовіла Серафіма. — Што хочаце рабіце, не дапушчу.

— А то і праўда, — пачухаў патыліцу старэйшы з рабочых. — Навошта нам умешвацца ў іхнія разборкі. Няхай самі вырашаюць з гэтай бярозай. На тое і "Зеленбуд" ёсць.

З таго дня Дарафееўна пачала, як яна сама казала, "аблагароджваць" двор ля дома. Паблізу бярозы (калі вясною бялілі стваллы бліжэйшых клёнаў і каштанаў, яе не кранaлі) жанчына высадзіла ва ўскапаную зямлю цыбуліны цюльпанаў.

Мінаў час. Пупышкі на сонечных угрэвах дрэў набухалі, на галінках з'яўляліся кволыя лісточкі. А на кветніку, які зрабіла Дарафееўна, расцвілі цюльпаны, потым касачы, белыя рамонкі.

— Вось раздабыць бы дзе камянёў ды акуратна абкласці кветнічак, — услых яна аднойчы выказала жаданне.

— Гэ, — усміхнуўся вусаты мужчына, што жыў у іхнім пад'ездзе і, як ведала Серафіма, працаваў дальнабойшчыкам. — Будзе вам, Дарафееўна, і каменне, і нават фарбы раздабуду.

Па праўдзе кажучы, яна ўжо і забылася на тую размову. Але аднойчы, калі корпалася над сваімі кветкамі, мужчына вываліў з мяшка цэлую горку камення.

— З іх можна цэлую крушню скласці, — разгладзіў ён вусы. — Вёз аж з Полаччыны, куды па справах ездзіў. — Так што, лічы, слова сваё стрымаў. Знаёмы каваль акуратна камені і паразбіваў, каб не папсаваць, як кажуць, прыгажосць.

— Ну, што ж. Дзякую, даражэнькі, — абрадавалася жанчына. — Вы можа чулі калі-небудзь песню пра бярозку?

— Не. А што?

— То паслухайце. У мяне, праўда, голас не асаблівы. Ды паспрабую праспяваць.

І яна зацягнула:

*Стаіць бярозка за акном,*
*З якога мне адкрыўся свет...*

— І яшчэ далей:

*...А я пачую шум лясоў:*
*Шляхі ў дзяцінства замяло.*
*І бачу сон з найлепшых сноў:*
*Бярозкі мілае святло...*

— А і праўда, — паківаў галавою шафёр. — Ад бяроставай кары быццам і сыходзіць тое ціхае святло.

— А няго ж. Няхай расце і шуміць лісцейкам. Радуе ўсіх нас. І дзяцей, і ўнукаў.

**Міхась ДАНІЛЕНКА**